# У найлепшых еўрапейскіх традыцыях

## У Беларусі адбыўся першы ў гісторыі Венскі баль



**Рабочую рэзідэнцыю Прэзідэнта Беларусі было не пазнаць: яна ператварылася ў сапраўдны палац. Да таго ж, святочны — тут не толькі ўпрыгожаная ёлка, пышныя ложы, доўгія сукенкі дам, старанныя кавалеры і Прэзідэнцкі аркестр, але і месца, дзе пануе шчыры казачны настрой. Ён адчуваўся нават у прэс-цэнтры...**

Шматлікія рэпетыцыі не прайшлі дарма. Па традыцыі баль адкрыўся паланэзам дэбютантаў, пасля якога Прэзідэнт пакінуў ложу, каб асабіста павітаць удзельнікаў вечара. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што дзякуючы ім у зале праявяць маладосць, талент і прыгажосць. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што год таму напярэдадні навагодніх свят у Палацы Незалежнасці адбыўся першы беларускі баль. Так адрадзілася адна з самых прыгожых танцавальных традыцый, блізкая для беларусаў, якія на працягу многіх стагоддзяў жылі і развіваліся ў самым сэрцы агульнаеўрапейскай культуры.

«Ва ўсе часы палацы з'яўляліся цэнтрам палітычнага і свецкага жыцця, дзе мастацтва на самым высокім узроўні суправаджала многія пратакольныя мерапрыемствы. І ў сучасным свеце яно адыгрывае вялікую ролю, у міжнароднай дыпламатыі асабліва, адкрывае новыя магчымасці для ўмацавання дружалюбных сувязяў паміж народамі і цэлымі дзяржавамі. Вось і сёння, выконваючы пераемнасць праваранага часам палітычнага этыкету, мы праводзім у нашым Палацы першы ў гісторыі сучаснай Беларусі Венскі баль. Але прашу зазначыць — гэта працяг той слаўнай традыцыі, якую мы з вамі адкрылі летась. У яго класічнай, вытанчанай атмасферы працягваем паспяхова пачаты двухбаковы дыялог з нашымі аўстрыйскімі сябрамі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Дарэчы, балю, каб лічыцца Венскім, неабавязкова праходзіць у сталіцы Аўстрыі. Больш важна адпавядаць усім крытэрыям, дакладна прытрымлівацца асаблівага бальнага пратакола. Гэта правіла ЮНЕСКА: Венскі баль унесены ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

На Венскі баль у Палац Незалежнасці былі запрошаны найлепшыя студэнты і старшакласнікі, а таксама прадстаўнікі рабочай моладзі.



«Пра што б вы ні марылі, куды б ні імкнуліся, не забывайце: мы — беларусы і краіна ў нас, радзіма ў нас адна. Захоўвайце сувязь з ёю. Памятайце, калі чалавек адрываецца ад сваіх каранёў, ён страчвае глебу пад нагамі і, самае галоўнае, крыніцу духоўнай сілы. Наша Радзіма, вялікая і малая, менавіта тут. Мы пабудавалі і захавалі суверэнную дзяржаву. І каму, як не вам, надзеі нацыі, вызначаць вектар развіцця на будучыню блізэйшую і аддаленую. Ад вашых памкненняў залежыць, якой будзе наша краіна», — звярнуўся да ўдзельнікаў балю Прэзідэнт.

І зноў закружыліся пары пад гукі аркестра. Аляксандр Лукашэнка асабіста прыняў удзел у выкананні каралеўскага танца — венскага вальса. Класічная частка бальнай карты ўключае польку, па-дэ-патынэр, галоп і паўночную кадрылю, а таксама гасцявыя нумары, майстар-клас па левабаковым вальсе і бальныя гульні «Паясок» і «Званочкі». Працягнуўся вечар адвольнай праграмай, у якую ўвайшлі ча-ча-ча, румба, самба, павольны факстрот, і фінальная кадрыля ў выкананні ўсіх гасцей балю, сярод якіх топ-чыноўнікі і дыпламаты».

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Аўстрыі ў Беларусі Алаізія Вёргетэр ад імя аўстрыйскай дэлегацыі прызнала, што аўстрыйскія традыцыі і любоў да прыгажосці і элегантнасці цудоўна прыжываюцца на беларускай зямлі. Пасол падаравала Прэзідэнту Беларусі хрустальны шар (што па-нямецку гучыць гэтак жа, як «баль») беларускай вытворчасці, напоўнены аўстрыйскімі цукеркамі «Моцарт». Пасол лічыць вельмі сімвалічнай камбінацыю беларускага і аўстрыйскага.

«Вельмі хацелася б, каб Венскі баль вяртаўся, зноў і зноў праходзіў у Мінску», — пажадала Алаізія Вёргетэр.

У адказ Аляксандр Лукашэнка паабяцаў, што Беларусь ад Венскага балю не адмовіцца і такое мерапрыемства будзе праводзіць штогод — з удзячнасцю аўстрыйскаму боку за дапамогу.

**Варвара МАРОЗАВА.**
**Фота БелТА.**

# ШАЙБУ!

### У пятніцу стартуе XVI Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

**У спаборніцтве, якое пачнецца на сталічнай «Чыжоўка-Арэне», паўдзельнічаюць 12 каманд: Кітая, Фінляндыі, Германіі, Расіі, Швейцарыі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, Украіны, ЗША, зборныя Балкан, Балтыі і ІІНF і каманда Прэзідэнта Беларусі.**

Пачнецца турнір 3 студзеня матчам Украіна — Швейцарыя на вялікай арэне. Урачыстая цырымонія адкрыцця запланавана ў гэты ж дзень у 17.30. Па інфармацыі прэс-службы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, 5 студзеня ў рамках турніру пройдзе акцыя «Калядная традыцыя», а 6 студзеня знакамітыя гульцы правядуць майстар-клас для ўдзельнікаў рэспубліканскіх спаборніцтваў сярод дзяцей і падлеткаў па хакеі «Залатая шайба».

На Каляды, 7 студзеня, пройдуць фінальныя матчы.

Упершыню ў гісторыі каляднага турніру выручка ад продажу білетаў на вячэрнія матчы будзе накіравана на дабрачыннасць. Сродкі пералічаць у Мазырскі дзіцячы дом. Па інфармацыі, размешчанай на афіцыйным сайце Федэрацыі хакея Беларусі, кошт білетаў на вячэрнія матчы складзе пяць беларускіх рублёў, на ўсе астатнія матчы — уваход свабодны.

Арганізатарамі турніру з'яўляюцца: Рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Прэзідэнцкі спартыўны клуб», Асацыяцыя «Федэрацыя хакея Беларусі», Міністэрства спорту і турызму, Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ЯК БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ ПОШТА Ў ПАЧАТКУ СТУДЗЕНЯ

**Прэс-служба РУП «Белпошта» паведаміла, як будуць працаваць паштовыя аддзяленні ў навагоднія і калядныя святы.**

Так, 1, 2, 5 і 7 студзеня 2020 года працаваць будуць толькі дзяжурныя аб'екты паштовай сувязі. Усе, хто жадае даведацца аб рэжыме работы АПС, могуць патэлефанаваць у кантакт-цэнтр РУП «Белпошта» па нумары 154. Звесткі таксама можна ўдакладніць на сайце РУП «Белпошта» ў раздзеле «Навіны кампаніі».

Нагадаем, што ў Беларусі 31 снежня з'яўляецца рабочым днём. 1 студзеня — а з гэтага года і 2 студзеня — выхадныя. Таксама нас чакаюць тры выхадныя дні на праваслаўныя Каляды: 5, 6, і 7 студзеня. За панядзелак, 6 студзеня, беларусы адпрацуюць у суботу, 4 студзеня.

**Святлана БУСЬКО.**

Надвор'е

# СЛІЗКА, ЗАНАДТА СЛІЗКА АДНАК

### У першы тыдзень студзеня ўначы невялікі мінус, а ўдзень — слабы плюс

**У апошнія выхадныя адыходзячага года ў нашай краіне ўсталяваўся зімовы характар надвор'я. Падмарозіла, у многіх раёнах утварылася снежнае покрыва. Больш за ўсё снегу выпала ў цэнтральных і паўночных раёнах краіны. Але, на жаль, надвор'е нестабільнае і ў панядзелак — аўторак нас яшчэ чакае адліга. Гэта атлантычны цыклон, які ссоўваецца па поўначы Еўропы і прынясе да нас ветранае з ападкамі надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння ўвечары ў многіх раёнах захаваецца моцны парывісты вецер. Уначы 1 студзеня і раніцай часам чакаецца снег, слабая завіруха. Тэмпература паветра ў навагоднюю ноч складзе ад нуля да мінус 5 градусаў. Удзень у сераду будзе пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог магчымая галалёдзіца. Зноў пацяплее і ўсё пацячэ — будзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла.

Надвор'е не будзе нас радаваць і ў другі дзень новага года. У асобных раёнах у чацвер пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца слабы туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да плюс 1 градуса, удзень — ад мінус 1 градуса да 5 цяпла. А вось у пятніцу, 3 студзеня, будзе пераважна без ападкаў. Месцамі чакаецца туман, уначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, а ўдзень — ад нуля да 6 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу ўначы месцамі, пераважна па паўночным захадзе краіны, удзень на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. У асобных раёнах чакаюцца слабы туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 6 градусаў да плюс 1 градуса, удзень будзе ад мінус 2 градусаў да 3 цяпла. Ці гэта зіма?

**Сяргей КУРКАЧ.**